ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі ўніверсітэт

№ 15 (971) | АЎТОРАК, 9 лістапада 1999 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

## ПАДЗЯКА ГАРВЫКАНКОМА

На адрас рэктара нашага універсітэта Л.А.Шамяткова дасланы падзячны ліст за подпісам першага намесніка старшыні гарвыканкома М.Д.Усава. Ён паведамляе: "Гомельскі гарадскі выканаўчы камітэт выказвае Вам сардэчную падзяку за актыўны ўдзел у падрыхтоўцы і правядзенні II Міжнароднага фестывалю харэаграфічнага мастацтва "Сожскі карагод".

Спадзяемся, што наша плённае супрацоўніцтва на карысць развіцця міжнародных культурных сувязей, фестывальных традыцый і працвітання нашага горада будзе працягвацца і ў далейшым."

Падзячныя пісьмы за подпісам в.а. дырэктара Гомельскага абласнога цэнтра народнай творчасці Э.А.Хлыстуновай дасланы на адрас прарэктара па культурна-асветніцкай рабоце А.В.Лысянкова і рэжысёра студэнцкага народнага тэатра Г.І.Вароніна, у якіх адзначаецца:

"Уся Ваша творчая дзейнасць скіравана на захаванне і адраджэнне лепшых традыцый беларускай нацыянальнай культуры ў шматлікіх яе праявах.

Мы ўдзячны Вам за асабісты ўклад у справу духоўнага ўзбагачэння чалавека, фарміравання яго эстэтычных густаў і культурнага кругагляду.

Прыміце нашы сардэчныя пажаданні плённай працы і творчых здзяйсненняў."

## ЗАМЕЖНЫЯ ГОСЦІ УНІВЕРСІТЭТА

У апошнія навучальныя гады, бадай, не было такога месяца, каб наш універсітэт не наведвалі навукоўцы замежных краін. Вось і сёлета ў кастрычніку на працягу тыдня ў ГДУ знаходзілася дэлегацыя лінгвістычнага цэнтра Брасхаус з англійскага горада Бірмінгем. Яе паездка была прадугледжана дагаворам аб супрацоўніцтве.

У склад дэлегацыі ўваходзілі прадстаўнікі розных прафесій, якія вывучаюць рускую мову. Яны праслухалі цыкл лекцый на кафедры рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства, а таксама правялі шэраг заняткаў на факультэце замежных моў для студэнтаў спецыяльнасці "Англійская мова".

З удзячнасцю ад еўрапейскіх гасцей быў прыняты каштоўны падарунак – метадычныя матэрыялы па англійскай мове для аднайменнай кафедры.

Адначасова з англійскай у ГДУ знаходзілася і дэлегацыя Янчжоўскага універсітэта з Кітайскай Народнай Рэспублікі. Мэта яе візіту – абмеркаванне і падпісанне дагавора аб супрацоўніцтве паміж дзвюмя вышэйшымі навучальнымі ўстановамі. Адначасова пасланцы далёкай азіяцкай краіны пацікавіліся ўмовамі навучання і быту кітайскіх студэнтаў, якія набываюць адукацыю ў ГДУ.

З вялікім задавальненнем калегі з Кітая зрабілі экскурсію па Гомелі, паглядзелі цыркавое прадстаўленне, наведалі горад-герой Мінск, дзе азнаёміліся са славутасцямі беларускай сталіцы, былі прыняты ў Белдзяржуніверсітэце.

**Б. ВАЛОДЗІН.**

## ДАСЛЕДУЕЦЦА СЛАВЯНСКАЯ ТЭМАТЫКА

Аднаму з вядучых факультэтаў — філалагічнаму — флагмана вышэйшай школы нашай краіны Белдзяржуніверсітэта споўнілася 60 гадоў. Да гэтага знамянальнага юбілею была прымеркавана традыцыйная IV Міжнародная навуковая канферэнцыя "Славянская літаратура ў кантэксце сусветнай", якая адбылася на філфаку БДУ. Разам з навукоўцамі беларускай сталіцы ў ёй удзельнічалі літаратуразнаўцы і мовазнаўцы з абласных цэнтраў нашай краіны, Расіі, Украіны, Літвы, Англіі, Польшчы, Турцыі.

На пленарным пасяджэнні сярод выступіўшых быў і прарэктар па вучэбнай і выхаваўчай рабоце універсітэта кандыдат філалагічных навук, дацэнт М.М.Воінаў.

На секцыйных пасяджэннях заслуханы і абмеркаваны даклады выкладчыкаў кафедры беларускай літаратуры А.М.Мельнікавай і А.В.Брадзіхінай.

Некалькі тэматычных даследаванняў нашых навукоўцаў уключаны ў зборнік тэзісаў міжнароднай канферэнцыі.

## ЗАЦВЕРДЖАНА Ў ВУЧОНАЙ СТУПЕНІ

***Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат гістарычнага факультэта, калектыў кафедры гісторыі Беларусі віншуюць асістэнта названай кафедры ЯШЧАНКА Аксану Рыгораўну з зацвярджэннем яе ВАКам у вучонай ступені кандыдата гістарычных навук.***

## УРУЧАНЫ ДЫПЛОМЫ ГАНАРОВЫХ ПРАФЕСАРАЎ

28 кастрычніка адбылося чарговае ў бягучым навучальным годзе пасяджэнне Савета універсітэта. Яно пачалося з урачыстай і вельмі прыемнай працэдуры. Рэктару члену-карэспандэнту НАН Беларусі Л.А.Шамяткову, загадчыку кафедры педагогікі акадэміку Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі І.Ф.Харламаву, прафесарам У.В.Анічэнку з кафедры беларускай мовы і В.А.Вахрушаву з кафедры геаграфіі былі ўручаны дыпломы "Ганаровы прафесар ГДУ імя Ф.Скарыны". Было прынята рашэнне аб прысваенні гэтага звання і прафесару кафедры эканамічных тэорый М.В.Навучыцелю.

На Савеце па інфармацыях першага прарэктара, прафесара М.В.Селькіна і намесніка старшыні прыёмнай камісіі прафесара С.Ф.Каморнікава заслуханы і абмеркаваны адпаведна пытанні аб выніках работы ДЭК і паказчыках летняй экзаменацыйнай сесіі, уступных экзаменаў ва універсітэт і задачах па арганізацыі новага набору.

На конкурснай аснове загадчыкамі кафедр абраны: АЛФК – дацэнт Г.І.Нарскін, беларускай культуры — дацэнт Д.Д.Паўлавец. Загадчыца кафедры беларускай мовы доктар філалагічных навук А.А.Станкевіч рэкамендавана на прысваенне вучонага звання прафесар.

На Савеце былі разгледжаны таксама некаторыя іншыя пытанні універсітэцкага жыцця.

## ВІНШУЕМ! ДА ЮБІЛЕЮ УНІВЕРСІТЭТА ЎЗНАГАРОДЖАНЫ

(Працяг. Пачатак у № 14.)

**Граматай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь:**

**СТАРАВОЙТАЎ М.І.**, кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі;

**СЫЦЬКО У.У.**, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар кафедры оптыкі;

**ШАЛУПАЕЎ С.В.**, кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт, загадчык кафедры радыёфізікі і электронікі;

**ЯЦУХНА В.І.**, кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай літаратуры;

**БАЛТРУШЭВІЧ Г.К.**, кандыдат эканамічных навук, дацэнт кафедры камерцыйнай дзейнасці і фінансаў;

**ІВАНОЎ Ю.П.**, кандыдат геолага-мінералагічных навук, дацэнт кафедры геалогіі і разведкі карысных выкапняў;

**ЗАЛАТАРЭНКА В.Ю.**, вучоны сакратар;

**КАНЯХІН М.В.**, кандыдат педагагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту;

**КЛЮЧНІКАЎ Ю.А.**, кандыдат юрыдычных навук, загадчык кафедры крымінальнага права і працэсу;

**КОШМАН М.Р.**, кандыдат педагагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры тэорыі і методыкі фізічнай культуры;

**ЛАЗУЧЭНКАВА Л.С.**, кандыдат эканамічных навук, дацэнт кафедры эканомікі і кіравання вытворчасцю;

**МАЖАРОЎСКІ В.В.**, доктар тэхнічных навук, прафесар, загадчык кафедры вылічальнай матэматыкі і праграміравання;

**МІРОНЕНКА У.І.**, кандыдат фізіка-матэматычных навук, прафесар, загадчык кафедры дыферэнцыяльных ураўненняў;

**ПУХАВА Н.П.**, кандыдат эканамічных навук, дацэнт кафедры эканамічных тэорый;

**САПЕГІН Л.М.**, доктар біялагічных навук, прафесар кафедры батанікі і фізіялогіі раслін;

**ЦІТОВА А.А.**, кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры ўсеагульнай гісторыі;

**ЮШЧАНКА Д.П.**, кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт кафедры матэматычнага аналізу;

**СЕМЯНКОЎ А.М.,** загадчык вучэбнымі лабараторыямі кафедры хіміі.

**ТВАРДОЎСКІ М.І.,** вядучы інжынер НДС.

**Ганаровай граматай Дзяржкамітэта па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь:**

**ГДУ імя Ф.Скарыны;**

**ЖОГЛА В.Г.,** дацэнт кафедры геалогіі і разведкі карысных выкапняў, кандыдат геолага-мінералагічных навук;

**ЛІН Д.Р.,** прарэктар па навуковай рабоце, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар;

**МАЛАШЧАНКА А.Ц.,** старшы навуковы супрацоўнік навукова-даследчага сектара;

(Заканчэнне на 2-й стар.)

## УЗНАГАРОДЫ ЎРУЧЫЛА ПАСОЛ

Да 50-гадовага юбілею са дня свайго ўтварэння, які адзначаўся 1 кастрычніка г.г., Кітайская Народная Рэспубліка накапіла рэдкі ў сусветнай практыцы вопыт перабудовы эканомікі. Да яго асаблівасцей вялікую цікавасць праяўляюць будучыя эканамісты нашага універсітэта. Заканамерна, што сёлета яны прынялі актыўны ўдзел у рэспубліканскім конкурсе студэнцкіх навуковых работ, які праводзіўся Беларускім таварыствам дружбы і культурных сувязей з замежнымі краінамі, Таварыствам "Беларусь-Кітай", пасольствам КНР у Рэспубліцы Беларусь.

На конкурс было прадстаўлена звыш ста студэнцкіх навуковых прац. Паказальна, што ўсе даследаванні студэнтаў-эканамістаў універсітэта адзначаны спецыяльнымі прызамі.

Вынікі конкурсу падводзіліся на ўрачыстым вечары, які адбыўся ў памяшканні Беларускага таварыства дружбы і культурных сувязей з замежнымі краінамі. Узнагароды яго пераможцам уручала Надзвычайны і паўнамоцны пасол Кітайскай Народнай Рэспублікі ў нашай краіне пані У.Сяоцю. Яна адзначыла высокі ўзровень навуковых даследаванняў гамяльчан і сваёй зямлячкі — выпускніцы эканамічнага факультэта ГДУ Чжан Жун Жун, якой дастаўся галоўны прыз, другакурсніцы Святланы Лін, студэнткі трэцяга курса Алены Сілуянавай, а таксама пяцікурсніцы геолага-геаграфічнага факультэта Марыны Цішынай. Пасла прыемна здзівіла добрае веданне выхаванкамі ГДУ старажытных паэтаў і вучоных Кітая, якія асабліва ўшаноўваюцца ў гэтай краіне.

Спецыяльнай узнагароды аргкамітэта конкурсу і пасольства Кітая ўдастоены навуковы кіраўнік нашых студэнтаў кандыдат эканамічных навук, дацэнт, загадчык кафедры эканамічных тэорый Б.У.Сарвіраў.



**На здымку: пасол КНР у Рэспубліцы Беларусь У.Сяоцю, навуковы кіраўнік дацэнт Б.У.Сарвіраў і студэнты ГДУ — пераможцы рэспубліканскага конкурсу.**

## ВІНШУЕМ! ДА ЮБІЛЕЮ УНІВЕРСІТЭТА ЎЗНАГАРОДЖАНЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

**МЕЛЬНІЧЭНКА І.М.,** загадчык праблемнай навукова-даследчай лабараторыі перспектыўных матэрыялаў, доктар тэхнічных навук, прафесар.

**Ганаровай граматай ВАК Беларусі:**

**ШАМЯТКОЎ Л.А.,** рэктар універсітэта, член-карэспандэнт НАН Беларусі, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар,

**СКІБА А.М.,** доктар фізіка-матэматыных навук, прафесар, загадчык кафедры алгебры і геаметрыі;

**АНІЧЭНКА У.В.,** прафесар кафедры беларускай мовы.

**Ганаровай Граматай Гомельскага абласнога выканаўчага камітэта:**

**БАГДАНАЎ М.І.,** кандыдат эканамічных навук, дацэнт кафедры эканамічнай інфарматыкі і аўтаматызаваных сістэм кіравання;

**КАЛМЫКОЎ У.М.,** доктар філасофскіх навук, прафесар, загадчык кафедры філасофіі;

**ПРАЛЯСКОЎСКІ Ю.А.,** кандыдат хімічных навук, дацэнт, загадчык кафедры хіміі;

**БАЛОГА У.П.,** рэдактар газеты "Гомельскі універсітэт";

**САХНО М.П.,** начальнік аддзела ТСН.

**Ганаровай граматай абласнога Савета дэпутатаў:**

**ДАЛІНСКІ М.С.,** начальнік інфармацыйна-вылічальнага цэнтра;

**ГАПЕЕЎ В.П.,** начальнік аддзела выхаваўчай работы з моладдзю;

**УСОВІЧ К.С.,** загадчык музея Францыска Скарыны;

**КАЛУГІН А.С.,** доктар медыцынскіх навук, прафесар кафедры фізіялогіі чалавека і жывёлін.

**Ганаровай граматай універсітэта:**

**ПАДСТРЫКАЧ Н.І.,** намеснік галоўнага бухгалтара па НДС.

**СВЯРДЛОВА Н.М.,** вядучы эканаміст.

**ГУЛЕВІЧ Р.П.,** старшы інспектар па кадрах.

**ЯРМАЛКЕВІЧ М.Ф.,** вядучы інжынер-патэнтазнаўца.

**СКРЖЭНДЗЕЎСКАЯ В.М.,** вядучы інжынер СНТІ.

**ПАКАТАШКІН Г.Л.,** старшы навуковы супрацоўнік.

**ЦІТОВА Н.М.,** малодшы навуковы супрацоўнік.

**Ганаровай граматай Гомельскага гарвыканкома:**

**ПАПЛАЎСКАЯ Ж.М.,** старшы выкладчык кафедры тэорыі і практыкі англійскай мовы.

**ЕЛІСЕЕВА І.М.,** доктар тэхнічных навук, загадчыца кафедры псіхалогіі і падрыхтоўкі да паступлення ў вну.

**АЛЯКСЕЙЧАНКА Г.А.,** кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі ўсходнеславянскіх народаў.

**КАЧАТКОЎ У.І.,** кандыдат гістарычных навук, дацэнт, загадчык кафедры палітычнай сацыялогіі.

**ГРЫЦАЎ Л.Б.,** начальнік аддзела матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння.

**ВАЛЧКОВА Т.А.,** бухгалтар прафкома.

**Ганаровай граматай Гомельскага гарадскога Савета дэпутатаў:**

**ЖАЛОНКІНА Т.П.,** старшы выкладчык кафедры агульнай фізікі.

**САКОВІЧ П.П.,** ст. выкладчык кафедры фізічнага выхавання і спорту.

**АЗЯЎЧЫКАВА Г.У.,** намеснік галоўнага бухгалтара.

**БЕЛЬЧАНКА В.Л.,** намеснік галоўнага бухгалтара.

**СОЦІЕВА Т.М.,** дырэктар прадпрыемства грамадскага харчавання.

**ХРАНЬКОВА Н.П.,** загадчыца вытворчасцю сталовай.

**СВЯРДЛОВА Н.М.,** вядучы эканаміст.

**ВАРАТНІЦКІ Г.І.,** старшыня прафкома.

**КОЛТЫШАВА Н.І.,** старшыня прафкома студэнтаў.

**Ганаровай граматай адміністрацыі Цэнтральнага раёна г.Гомеля:**

**ПАЎЛАВЕЦ Д.Д.,** кандыдат філалагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры беларускай культуры.

**СЕМЯНЧУК У.М.,** кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт, загадчык кафедры вышэйшай матэматыкі.

**ГАЛАВАЧ У.А.,** старшы выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту.

**САЛЬНІКАВА Л.К.,** загадчыца аддзела бібліятэкі.

**МАКСІМЕНКА Н.К.,** вядучы інжынер-матэматык ІВЦ.

**ЗАЛАТЫХ С.А.,** галоўны ўрач санаторыя-прафілакторыя.

**Ганаровай граматай БРК прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі:**

**ШАМЯТКОЎ Л.А.,** рэктар універсітэта.

**ВАЙЦІШКІНА А.Л.,** старшы выкладчык кафедры фінансаў і камерцыйнай дзейнасці, член прафкома.

**КОЛТЫШАВА Н.І.,** старшыня прафкома студэнтаў.

**ЛІСОЎСКІ В.В.,** старшы выкладчык кафедры фізічнага выхавання і спорту, член прафкома.

**Ганаровай граматай абласнога Савета прафсаюзаў:**

**ВАРАТНІЦКІ Г.І.,** старшыня прафкома.

**Ганаровай граматай абкома прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі:**

**МЯРЭЖА Л.В.,** кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт кафедры МПК.

**СТРЫЖНЕЎ У.С.,** кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт кафедры агульнай фізікі.

**СЕМЯНКОЎ А.М.,** загадчык вучэбнымі лабараторыямі кафедры хіміі.

**ВАЛЧКОВА Т.А.,** бухгалтар прафкома.

## ЦЯПЕР ЯШЧЭ МІЛЬЁНЫ, А ХУТКА БУДУЦЬ ТЫСЯЧЫ. І, ПЭЎНА, ЖЫЦЬ ЛЯГЧЭЙ НЕ СТАНЕ

### НОВАЯ ЗАРАБОТНАЯ ПЛАТА ВЫКЛАДЧЫКАЎ

| Наименование должностей | Исходный оклад | Повыш. тар.став. за стаж, % | Повыш. тар.став. за стаж, сумма | Должностной оклад |
|---|---|---|---|---|
| **Заведующий кафедрой** | | | | |
| имеющ. стаж свыше 15лет | 15 990 000р. | 20% | 3 198 000р. | **19 188 000р.** |
| имеющ. стаж свыше 10лет | 15 990 000р. | 15% | 2 398 500р. | **18 389 000р.** |
| имеющ. стаж свыше 5лет | 15 990 000р. | 10% | 1 599 000р. | **17 589 000р.** |
| имеющ. стаж свыше 1 года | 15 990 000р. | 5% | 799 500р. | **16 790 000р.** |
| имеющ. стаж до 1 года | 15 990 000р. | 0% | -р. | **15 990 000р.** |
| **Профессор** | | | | |
| имеющ. стаж свыше 15лет | 15 240 000р. | 20% | 3 048 000р. | **18 288 000р.** |
| имеющ. стаж свыше 10лет | 15 240 000р. | 15% | 2 286 000р. | **17 526 000р.** |
| имеющ. стаж свыше 5лет | 15 240 000р. | 10% | 1 524 000р. | **16 764 000р.** |
| имеющ. стаж свыше 1 года | 15 240 000р. | 5% | 762 000р. | **16 002 000р.** |
| имеющ. стаж до 1 года | 15 240 000р | 0% | -р. | **15 240 000р.** |
| **Доцент** | | | | |
| имеющ. стаж свыше 15лет | 13 830 000р. | 20% | 2 766 000р. | **16 596 000р.** |
| имеющ. стаж свыше 10лет | 13 830 000р. | 15% | 2 074 500р. | **15 905 000р.** |
| имеющ. стаж свыше 5лет | 13 830 000р. | 10% | 1 383 000р. | **15 213 000р.** |
| имеющ. стаж свыше 1 года | 13 830 000р. | 5% | 691 500р. | **14 522 000р.** |
| имеющ. стаж до 1 года | 13 830 000р. | 0% | -р. | **13 830 000р.** |
| **Старший преподаватель** | | | | |
| имеющ. стаж свыше 15лет | 13 170 000р. | 20% | 2 634 000р. | **15 804 000р.** |
| имеющ. стаж свыше 10лет | 13 170 000р. | 15% | 1 975 500р. | **15 146 000р.** |
| имеющ. стаж свыше 5лет | 13 170 000р. | 10% | 1 317 000р. | **14 487 000р.** |
| имеющ. стаж свыше 1 года | 13 170 000р. | 5% | 658 500р. | **13 829 000р.** |
| имеющ. стаж до 1 года | 13 170 000р. | 0% | -р. | **13 170 000р.** |
| **Ассистент, преподаватель** | | | | |
| имеющ. стаж свыше 15лет | 11 940 000р. | 20% | 2 388 000р. | **14 328 000р.** |
| имеющ. стаж свыше 10лет | 11 940 000р. | 15% | 1 791 000р. | **13 731 000р.** |
| имеющ. стаж свыше 5лет | 11 940 000р. | 10% | 1 194 000р. | **13 134 000р.** |
| имеющ. стаж свыше 1 года | 11 940 000р. | 5% | 597 000р. | **12 537 000р.** |
| имеющ. стаж до 1 года | 11 940 000р. | 0% | -р. | **11 940 000р.** |

**Доплаты в месяц:**

за ученую степень доктора наук — (6 мин.з/пл.) – 8 700 000 р. в месяц;
кандидата наук – (3 мин. з/пл.) – 4 350 000 р.;
за и.о. декана – (70% от ст.1 разряда) – 2 100 000 р.;
за и.о. зам. декана – (65% от ст.1 разряда) — 1 950 000 р.

| № п/п | Контингент обучающихся | Ставки почасовой оплаты труда в % от ставки первого разряда | | |
|---|---|---|---|---|
| | | профессор, доктор наук | доцент, кандидат наук | лица, не имеющие ученой степени |
| 1. | Учащиеся школ, профессионально-технических учебных заведений, гимназий, колледжей, средних специальных учебных заведений и др. аналогичные категории обучающихся, рабочие, работники, занимающие должности, требующие среднего специального образования, слушатели курсов | 9% 270 000 | 8% 240 000 | 7.50% 225 000 |
| 2 | Студенты | 11.60% 348 000 | 10.50% 315 000 | 8.50% 255 000 |
| 3 | Аспиранты, слушатели учебных заведений по повышению квалификации руководящих работников и специалистов, слушатели курсов по изучению белорусского языка | 14.70% 441 000 | 13.20% 396 000 | 11.60% 348 000 |

## У ЛІКУ ЛАЎРЭАТАЎ

Гомельская філія Беларускай асацыяцыі журналістаў віншуе дацэнта кафедры тэорыі і методыкі фізічнай культуры, рэдактара газеты "Навіны Палесся плюс" Уладзіміра Старчанку з перамогай у рэспубліканскім конкурсе на лепшую журналісцкую работу.

Журы Сусветнага інстытута свабоднай прэсы абрала Уладзіміра Старчанку лаўрэатам конкурсу ў намінацыі "Лепшы аналітычны матэрыял". Жадаем яму далейшых поспехаў як у навуковай, так і ў журналісцкай дзейнасці.

**Анатоль ГАТОЎЧЫЦ, старшыня Гомельскай філіі БАЖ, уласны карэспандэнт "Народнай газеты" па Гомельскай вобласці.**

## СТЫПЕНДЫЯ СТУДЭНТА

З 1-га кастрычніка г.г. устаноўлены дзяржаўныя стыпендыі для студэнтаў вну ў наступных памерах: імянная стыпендыя — 5 млн. 655 тыс. руб.; вучэбныя стыпендыі па выніках сесіі для студэнтаў гуманітарных, эканамічных і педагагічных спецыяльнасцей складаюць пры балах: ад 3,6 да 4,0 — 2 млн. 900 тыс.руб., ад 4,0 да 4,5 — 3 млн. 190 тыс.руб., ад 4,5 да 5,0 — 3 млн. 770 тыс.руб., пры 5,0 — 4 млн. 350 тыс.руб.

Для студэнтаў прыродазнаўча-навуковых і тэхнічных спецыяльнасцей памер стыпендый складае пры балах: ад 3,4 да 4,0 — 2 млн. 900 тыс. руб., ад 4,0 да 4,5 — 3 млн. 480 тыс.руб., ад 4,5 да 5,0 — 4 млн. 060 тыс.руб., пры 5,0 — 4 млн. 640 тыс.руб.

Персанальная стыпендыя савета вну — 3 млн. 770 тыс. руб., сацыяльная — 2 млн. 320 тыс.руб.

Для слухачоў падрыхтоўчага аддзялення з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апякунства бацькоў, стыпендыя выплачваецца ў памеры 1 млн. 813 тыс.руб.



**На лекцыях і практычных занятках першакурснікі паступова спасцігаюць таямніцы сваёй будучай прафесіі.**

**На здымку: студэнты I курса спецыяльнасці "Англійская мова" з дапамогай выкладчыцы В.Кашавенка вывучаюць фанетычныя тонкасці замежных слоў.**

**Фота М.Бяльковіча.**

## УВАГА! КОНКУРС!

Ва універсітэце праводзіцца конкурс на лепшы падручнік і лепшы вучэбна-метадычны дапаможнік, выдадзеныя ў 1997-1998 гг. Да ўдзелу ў конкурсе прымаюцца:
— падручнікі;
— вучэбныя дапаможнікі;
— вучэбна-метадычныя дапаможнікі;
— наглядныя дапаможнікі;
— тэксты лекцый;
— практычныя, даведкавыя дапаможнікі;
— практыкумы;
— іншыя тэарэтычныя распрацоўкі, выдадзеныя як у выдавецтве універсітэта, так і па-за яго і якія прайшлі апрабацыю на працягу не менш аднаго года.

**Мэтамі конкурсу з'яўляюцца :**
— актывізацыя ўнутрывузаўскага выдання вучэбнай і вучэбна-метадычнай літаратуры і аналіз выкарыстання яе студэнтамі;
— кантроль за арганізацыяй работы па ўдасканальванню вучэбнага працэсу;
— абагульненне і распаўсюджванне перадавога педагагічнага вопыту па ўдасканальванню вучэбнага працэсу;
— укараненне вынікаў навукова-метадычнай работы кафедр і асобных выкладчыкаў у практыку выкладання.

**Удзельнікамі конкурсу могуць быць:**
— штатныя выкладчыкі універсітэта;
— выкладчыкі-сумяшчальнікі;
— навуковыя супрацоўнікі;
— супрацоўнікі вучэбна-дапаможнага складу.

Конкурс праводзіцца ў два туры. **Першы** тур конкурсу праводзіцца метадычнымі саветамі на факультэтах з **1 лістапада па 20 снежня 1999 года.** У першым туры конкурсу прымаюць удзел усе кафедры, выкладчыкі і іншыя супрацоўнікі, якія прадставілі на конкурс падручнікі і вучэбна-метадычныя дапаможнікі. Яны разглядаюцца метадычным саветам факультэта, які ажыццяўляе адбор лепшых (не больш 3) работ для ўдзелу ў другім туры і разам з пратаколам (выпіскай з пратакола) пасяджэння метадычнага савета і рэцэнзіямі прадстаўляе ў журы другога тура конкурсу.

**Другі** тур конкурсу праводзіцца з **1 студзеня па 1 лютага 2000 года**. Прызначаецца журы, якое вызначае пераможцаў конкурсу. Дапаможнікі, якія прадстаўляюцца на другі тур конкурсу, аналізуюцца і рэцэнзуюцца экспертамі ў адпаведнасці з наступнымі напрамкамі:
— прыродазнаўча-навуковы профіль;
— гуманітарны профіль;
— педагагічны профіль;
— эканамічны профіль;
— тэхнічны профіль.

Для пераможцаў конкурсу ўстанаўліваюцца:
— **грашовыя прэміі** (адна першая, дзве другія, тры трэція);
— званне **"Лаўрэат конкурсу" з выплатай грашовай прэміі**;
— **заахвочвальныя прэміі**.

Журы конкурсу мае права не прысуджаць прэмій, калі не акажацца дастойных работ, або абмежавацца прысуджэннем меншай колькасці прэмій.

**Журы конкурсу.**

*Экспедыцыі*

## ЗНАХОДКА ЦІКАВАЯ І ЎНІКАЛЬНАЯ

Гомельская маладзёжная грамадская арганізацыя "Талака" сумесна са студэнтамі БелДУТа, якія набываюць спецыяльнасць архітэктара, правяла этнаграфічную экспедыцыю ў вёску Харомцы Акцябрскага раёна Гомельскай вобласці. Тут захавалася ўнікальная і адзіная вядомая на Гомельшчыне драўляная разная брама канца другой паловы XIX стагоддзя.

Яна ніколі раней не была зафіксавана (акрамя некалькіх фотаздымкаў). Удзельнікі экспедыцыі падрабязна замералі, замалявалі і зафатаграфавалі цікавую этнаграфічную знаходку. Таксама было праведзена апытанне мясцовых старажылаў. Яны расказалі цікавыя падрабязнасці з гісторыі гэтай брамы і касцёла, перад якім яна калісьці стаяла, але які цяпер ужо не існуе.

Плануецца, што ў далейшым гэтыя сабраныя матэрыялы будуць выкарыстаны пры падрыхтоўцы праектнай дакументацыі для правядзення рэстаўрацыйных работ.

Асобную падзяку хочацца выказаць аддзелу культуры Гомельскага аблвыканкома ў асобе Зоі Іванаўны Більчэнка за аказаную арганізацыйную дапамогу.

Асабліва прыемна тое, што ў гэтай творчай і карыснай працы актыўна ўдзельнічае моладзь.

**Яўген МАЛІКАЎ,**
**студэнт V курса гістфака.**



**На здымку: удзельнікі экспедыцыі Я.Малікаў, А.Чапега, А.Маргуліс (злева направа).**

*Пункт гледжання*

## ЗРАЗУМЕЦЬ ДЗІЦЯЧЫ СВЕТ

Нярэдка можна пачуць ад незадаволеных мам і тат скаргі, тыпу: "Ну ў мяне і сынок (дачка). Нічога не вучыць, не слухаецца. Адны ўбранні і "Иванушки" у галаве".

Раней я ніколі не задумвалася аб такіх "няшчасцях", пакуль сама не стала сведкам сямейна-выхаваўчых "лекцый". І ўсё – дзякуючы маім "цікавым" суседзям.

Уся справа ў тым, што амаль кожны дзень, калі я прыходжу з універсітэта, з задавальненнем слухаю "папсовыя" песні, якія за сцяной уключае мой "хіповы" сусед "дзі-джэй". Прычым я ўпэўнена, што з яго атрымаўся б неблагі "Белы арол", так старанна ён цягне "Я-а по тебе ску-у-у-ча-аю". Але, на жаль, усё добрае калісьці заканчваецца. І вось прыходзіць камандзір сямейства – сольнае выступленне заціхае і пачынаецца выконванне ўрокаў. Нябога "дзі-джэй"! Дзе яго прыгожае: "Солнышко в руках...". Не, зараз справы важныя: ідуць заняткі сінтаксісам.

— Колькі табе паўтараць, што выказнік падкрэсліваецца дзвюмя рысамі, а дзейнік — адной , — чую я. Здаецца, ужо і маці ўпэўнілася ў тым, што гаворыць, а "белы арол" толькі нешта мыкае, абараняючыся словамі "Нам гэта не растлумачвалі".

— Вось і будзеш пакутаваць з такімі ў школе, — кажуць мне знаёмыя.

А я з усмешкай адказваю і не стамляюся паўтараць, што дзяцей дрэнных не існуе. Гэта мы, дарослыя, не можам у сваіх турботах зразумець іхні свет. І няхай ён маленькі і крохкі, але ён ёсць. Мы зараз абвінавачваем Захад з яго "рэвалюцыямі", дрэнную музыку, якая адмоўна ўплывае на псіхічны стан нашых чад, камп'ютэры, якія адцягваюць іх ад заняткаў, тэлебачанне, відзікі і г.д.

А што зрабілі мы, каб дзіця зачытвалася Пушкіным, любіла прыроду, цікавілася матэматыкай? Не трэба забываць, што ўсё пачынаецца з сям'і, дзе нярэдка малога не заўважаюць, ён усё робіць не так, як трэба і , наогул, нічога не разумее.Потым — дзіцячы садок. Тут дзецям паўтараюць, што яны ўжо дарослыя, але гэтага гаварыць нельга, пра тое пытаць нетактоўна. І вось цудоўныя школьныя гады! Мае будучыя калегі! Гэта – наш час! Тут менавіта мы, настаўнікі, выпускнікі вну, павінны выправіць памылкі папярэдніх "выхавальнікаў". Каму ж, як не нам, усёведаючым і адукаваным, вывучаючым псіхалогію і гісторыю, зберагаць у душах дзяцей агеньчык Пяшчоты і Утульнасці? Хто, як не мы, здолее абудзіць у дзяцей жаданне развіваць свае здольнасці, любіць Радзіму і паважаць людзей.

...А ў суседзяў ужо ціха. Заняткі, напэўна, паспяхова скончыліся, і ўсе засталіся задаволеныя. Добра, зараз і я змагу сканцэнтравацца на латыні.

"Крошка мо-оя, я по тебе ску-ча-аю..."

(А ўсё ж такі паслухаю другое аддзяленне канцэрта. Чалавек жа стараецца).

**Таццяна ЦЕЛЯХОВІЧ,**
**студэнтка гр.РБ-23 філалагічнага факультэта.**

## ТЕ, КТО РЯДОМ



*Этот добрый причал*
*Называется буднично*
*домом.*
*Ты вступаешь в него —*
*И опять набираешься*
*сил,*
*И на каждом шагу*
*Проступает светло*
*и знакомо,*
*Все во имя чего*
*Ты дороги свои*
*выносил.*

**Евгений НЕФЕДОВ.**

В душном, тесном, битком набитом автобусе я стал невольным свидетелем чужого разговора: "Кажется, хотя бы "баксов" 100 приносить в дом, и вздохнули бы с облегчением. Заказов нет и заработка нет. А тут еще слухи: опять сокращение. Все ходят запуганные, "шестерят", за свою шкуру трясутся. На работе нервы измотаешь, домой приходишь – все на своих выплескиваешь".

Захотелось взглянуть на говорившего за моей спиной мужчину, но вовремя подавил в себе праздное любопытство. Человеку тут и так не сладко, да и нужен ли ему мой сочувственный взгляд.

Конечно, здоровый, сильный мужчина, не дурак и не лентяй, и руки – не крюки, а заработать на нормальную жизнь для своей семьи не в состоянии. Не у всех же коммерческая жилка имеется. Он обижен и даже зол. На государство, на начальника цеха, на бывших друзей-товарищей. Кто-то же должен быть виноватым во всех его несчастьях.

"Виноватыми" оказываются самые близкие люди, те, кто рядом. Конечно, потом, остыв, в душе пожалеешь: а они-то причем? Да вот только оправдываться вряд ли пойдешь, ложное мужское самолюбие не позволит. Мол, и так простят.

Конечно, простят, куда они денутся? Вот только еще одна обида горькой каплей упадет в душу и долго еще будет горчить.

"Возлюби ближнего своего, как самого себя" – учит нас христианство. И мы, повернувшие в последнее время к религии свои души, стараемся любить соседей, сослуживцев, случайных пассажиров в транспорте. Но почему мы не начинаем с самых близких, с тех, кто рядом?

Те, кто рядом... Твои близкие и родные и, прежде всего – твоя семья. Уж сколько писали, прогнозировали – семья отмирает, семья – это не модно, долой семейный хомут! И что же? Почему-то, скинув один хомут, все – и мужчины, и женщины – тут же лезут в другой, причем, добровольно. А в результате: "заключить второй брак, чтобы понять, что первый не был ошибкой".

Так, может не стоит экспериментировать, а надо просто ценить и беречь того, кто рядом?

Надо ценить своего мужа за то, что он твой муж и уже этим он лучше всех остальных. Вспомни, сколько в молодости находилось их, удальцов-красавцев, готовых поухаживать за тобой? Но жениться предложил именно он. Именно он решился взять ответственность на себя за твою будущую жизнь, за твоих (и его, конечно же) детей. А ведь эта ответственность велика, нам мужчинам, в этой жизни гораздо сложнее. В трудную минуту жена всегда может "выпустить пар" и "попилить" нас, мол, плохо обеспечиваешь семью. Мы, мужчины, и впрямь в этой жизни крайние.

Надо ценить свою жену за то, что она твоя жена и твоим детям тепло и уютно под ее крылом. А то, что она курица-наседка, это ли недостаток? Неужели, если бы было с точностью до наоборот, это тебя больше устраивало? И пусть у кого-то жена красивее, стройнее, моднее. Недаром народная мудрость гласит: "Женщины – все разные, но жены – все одинаковые".

Надо ценить своих детей за то, что они твои дети и этим они лучше всех детей на земле. У соседей тоже дети – лучше всех, но уже для них. Потому любите, цените, хвалите, не боясь их этим испортить, прежде всего своих детей. И никогда не обижайте их словами: "У всех дети, как дети, а ты..."

Надо ценить свою семью уже за то, что это – твоя семья, твоя опора, твоя защита, твое прибежище. Говорят, на Западе крепкая семья – это опять модно и престижно. Цените ближнего своего – и тогда дальние оценят вас.

**С.ЖАГОРОВ,**
**ст.преподаватель кафедры теории и истории государства и права.**

*Памятка читателю*

## НЕ РАСТЕРЯТЬСЯ В КНИЖНОМ МИРЕ

**К услугам абонентов в библиотеке Гомельского государственного университета имеются следующие отделы:**

- справочно-библиографический;
- 5 абонементов;
- 3 читальных зала;
- МБА;
- методический кабинет.

Основную учебную литературу студенты получают на следующих абонементах:

| № абонемента | Название факультета |
|---|---|
| **Абонемент № 1** ул. Кирова, 119, ауд.1-19 | Биологический; Геолого-географический; Математический; Психологический; Физической культуры. |
| **Абонемент № 2** ул. Советская, 106 | Иностранных языков; Исторический; Правоведения; Филологический. |
| **Абонемент № 3** ул. Советская, 104, ауд. 1-3 | Экономический. |
| **Абонемент № 4** ул. Советская, 102, ауд. 2-8 | Физический. |
| **Абонемент № 5** ул. Советская, 104, ауд.3-5 | Преподаватели, сотрудники и студенты всех специальностей. |

**В библиотеке действует единый читательский билет.**

Для написания рефератов, курсовых, дипломных и контрольных работ студенты могут обращаться на любой абонемент за необходимой литературой.

На абонементе № 5 (ул.Советская, 102, ауд. 3-5) можно получить литературу на английском языке по всем отраслям знаний.

Абонемент также начал комплектовать фонд литературой на немецком и польском языках.

На всех абонементах (кроме абонемента № 5) есть учебники по следующим дисциплинам:

- политология;
- история Беларуси;
- философия;
- психология;
- иностранные языки;
- медицинская подготовка;
- гражданская оборона.

В библиотеке к услугам читателей имеются три читальных зала, в которых собирается литература по всем изучаемым в ГГУ дисциплинам. Однако в более полном объеме читальные залы собирают фонды по следующим предметам:

**ЧИТАЛЬНЫЙ ЗАЛ № 1**

Корпус №4, ул.Советская, 104, ауд. 2-1

- **Экономика;**
- **Филология;**
- **Геология;**
- **Вычислительная техника;**
- **Информатика;**
- **Правоведение.**

**ЧИТАЛЬНЫЙ ЗАЛ № 2**

Корпус № 2, ул.Кирова, 119, ауд. 3-9

- **Математика;**
- **История;**
- **Правоведение;**
- **Вычислительная техника;**
- **Информатика;**
- **Биология;**
- **Физическая культура и спорт;**
- **Химия;**
- **Сельское хозяйство;**
- **Медицина.**

**ЧИТАЛЬНЫЙ ЗАЛ № 3**

Корпус № 5, ул. Советская, 102, ауд. 2-8

- **Физика;**
- **Астрономия;**
- **Электроника, радиотехника;**
- **Вычислительная техника;**
- **Черчение;**
- **Отраслевая литература на английском языке.**

Литературу для рефератов, курсовых, дипломных и контрольных работ вам помогут подобрать в справочно-библиографическом отделе (корпус № 4, ауд. 3-4). Там же можно работать со справочниками по различным отраслям знаний, энциклопедиями, а также библиографическими указателями и летописями журнальных и газетных статей. Кроме того, все абонементы и читальные залы имеют справочный аппарат на свои фонды. Если необходимого документа нет в фондах библиотеки, абонентам поможет междубиблиотечный абонемент, который находится в корпусе № 4, ауд.1-3.

Замена утерянных книг производится в отделе комплектования, который находится в корпусе № 4, аудитория 1-7а.



***Восень, напэўна, самая паэтычная пара. Гэта даказвае і вялікая колькасць вершаў, якія студэнты ГДУ – пачынаючыя аўтары (ёсць сярод іх дзеці выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта) прыносяць у рэдакцыю нашай газеты. Многім з іх яшчэ далёка да дасканаласці, адточанасці думкі і паэтычнага вобраза. Але тая шчырасць, што ўкладзена ў іх вершы, не можа не кранаць. Не будзем надта строгімі суддзямі, няхай першая публікацыя з'явіцца для пачынаючых аўтараў невялікім авансам на будучую творчасць – больш сур'ёзную і сталую.***

*Уладзіслаў* **БАГАМОЛЬНІКАЎ**

## ПАКІНУТАЕ

*Прысвячаецца маленькай вёсачцы Смалегаў, што ў Нараўлянскім раёне.*

*Дзесьці ў Палессі яшчэ захаваўся*
*Край першабытны, лясы і дрыгва,*
*Ды й невялічкі пасёлак застаўся*
*Там, дзе калісь працякала Мытва.*

* * *

*Мілы куток мой, Радзімы пяшчотай,*
*Ты б і цяпер мне душу саграваў.*
*Аж раптам лёс, як палыні гаркотай,*
*Шчасця майго ланцужок абарваў.*

*Недзе ў далёкім і светлым мінулым*
*Я назаўсёды пакінуў цябе,*
*Нібы старонку жыццё адгарнула,*
*Нібы кругі разышліся ў вадзе.*

*На працягу ўжо шматлікіх стагоддзяў*
*Ўсяк, хто жадаў, твае рысы ганьбіў.*
*Мову таптаў, вынішчаў асяроддзе...*
*Ў той цяжкі час – ты жыцця не згубіў.*

*Што ж адбылося так хутка з табою?*
*Ўвесь апусцелы стаіш ты ў журбе.*
*Толькі халоднай начною парою*
*Курчацца птушкі на хілай вярбе.*

* * *

*Родная вёска, мой боль незлічоны!*
*Ты мой найлепшы ў жыцці ўспамін!*
*Помнік маленства мой незасмучоны!*
*Варта да гэтых звярнуцца часін...*

* * *

*Вечар. Гуляюць па вуліцах дзеці.*
*З выгану цягнуцца статкі кароў.*
*І шчэ здалёк, нібы зорачкі свецяць,*
*Вокны ў хацінах тваіх жыхароў.*

*Хутка ля вогнішч збіраюцца людзі.*
*Спевы чуваць аж у кожным кутку.*
*З захадам сонца як быццам марудзіць,*
*Нібы прадбачыць пачатак канцу.*

*Бэзавы водар разліты ў паветры,*
*Ціха хістаюцца кроны бяроз.*
*І цвыркуны веснавыя канцэрты*
*У садзе даюць, што ўвесь квеццем парос.*

*У небе самотны з'яўляецца месяц,*
*Печанай бульбы разносіцца пах...*
*Гэтага ў памяці мне не закрэсліць,*
*Ўсё гэта бачу праз слёзы ў вачах.*

*Зараз жа, сам на сябе не падобны,*
*Край мой зрабіўся жытлом варання.*
*Так адгукнуўся ў Палессі Чарнобыль,*
*Так папакутвала наша зямля.*

*Вёску маю кожны дзень абвяшчае*
*Сумны дакучліва лямант гракоў.*
*Дрэвы маўкліва крычаць ад адчаю,*
*Ды апусцелыя гнёзды буслоў.*

*Веснічкі вецер гайдае са скрыпам,*
*Трапіў мой двор у палон хмызняку.*
*Дошкамі вокны на хатах забіты.*
*Да адраджэння нябачна шляху.*

---

*Больш не засяляцца гэтыя хаты.*
*Вёска! Навек уваход твой закрыты.*
*Стане ў гісторыі сімвалам страты*
*Край мой пакінуты, край мой забыты...*

---

**Сяргей ПАДСАСОННЫ,**
**студэнт гр.РБ-23**
**філалагічнага факультэта.**

***Байка***

## ДАРОГА Ў РАЙ

***(Памяці дзеда прысвячаю)***

Жыў дзед Піліп...Усё ішло
Само-сабой паволі;
Бяда не рушыла кубло,
Ганяў гусей — што болей?
Унучак неяк завітаў:
— Давай, стары, у горад!
У маладосці шмат спазнаў —
Забудзься ж голад-холад!
—А што, старыя ўжо няма,
Губляць мне незамнога:
Гнілая хата —
Дык яна не вабіць жа нікога.
Не тое будзе — я вярнусь,
А мо бог дасць і добра;
Яшчэ душою загарусь:
Найду кабету модну...
І вось ужо лясы, палі,
Дарога ўдаль віецца,
Шумяць у працы "Жыгулі",
А дзеду рай здаецца.
Нейк задрамаў. Унук тут:
—Дзед, паслухай-ка "музоны",
Шырэй цяпер глядзі на свет,
Спачатку рок-эн-ролы.
А вось "металы" — пацяжэй,
Табе я гэта раю.
Ты станеш панкам да вушэй...
Я скуру й цапы маю.
Ды што за скура, за цапы,
Мой дзед і знаць не знае,
То ўнучак, мабыць, для красы
Жывёлін даглядае,
А "банк" — дык той, хто іх пасе,
Няўцям бярэ, міргае...
—Унучак, "банкам" буду, так,
Вядома ўсяка праца...
Мне ж адкажы, што за мастак
Ляшчыць вядром, то тазам?
— Які ж то таз, дзе ж ёсць вядро?..
Тут "сінтэз", бас-гітара.
Ці ж чуў ты, дзед, каб так гуло,.
Каб так гармонь зайграла?
— Гармонь спявала — не гула,
Аж кроў мая нямела.
Рука іграці не магла,
Душа ўсю ноч трымцела.
— Дзед, наша музыка найлепш
Ад краю і да краю,
Яна, бы казка, дзіўны верш,
А іншай не прызнаю.
Дайшло да дзеда, куды ён,
У рай які ён едзе,
Каб слухаць гэты цяжкі звон,
Што лепшы ў мапедзе.
Сказаў унуку ціха: "Стой!",
Устаў і бамкнуў дзверцай:
— Мне пекла ўжо не за гарой,
У рай, здаецца ж, з'ездзіў!
І доўга-доўга зваў унук,
Нарэшце, рушыў далей,
Ды толькі колаў хціўы гук
Пранёсся ціхай хваляй.
Ізноў лясы, ізноў палі,
Дарога ўдаль віецца,
Ступаюць ногі па раллі,
Што роднаю завецца.

**Елена ГУЛЕЙ,**
**студентка I курса биологического факультета.**

* * *

Пусть холод стен меня согреет,
Я никому здесь не нужна,
Меня никто не пожалеет —
Я ведь одна...

Печаль и грусть ко мне вернулись,
Опять бессонница пришла.
В душе слова любви проснулись,
Но я одна...

Порой мне кажется — навечно
Со смертью я обручена,
И время льется бесконечно
И я одна...

Но все мы смертны в этом мире,
Над нами смерти власть сильна
Я признаюсь в своем бессилье
Раз я одна...

И смерть мне менее страшна,
Чем то, что я совсем одна.

**Юра ВИШЕНКОВ,**
**школьник.**

* * *

Стук колес поездов,
Гул моторов машин,
Шорох стертых подошв
И заезженных шин...
Эти звуки меня
Прочь от дома влекут,
В бесконечную даль
Путешествий зовут.
И романтика пыли
Песчаных дорог,
Треск костра, звон росы
И рассвета восторг
Не дают мне покоя
Ни ночью, ни днем.
Ни за что не расстанусь
С походным котлом!

* * *

Лениво время тянется опять,
Опять зима с весною насмерть бьется.
Зачем борьба? Ведь нечего терять —
Она не раз назад еще вернется.
Зима и лето, осень и весна...
Из года в год как феникс возрождались.
Так было до и после тоже ждет,
Их очередность не сменить веками.
Из этой очереди рвутся месяца,
И отбивая друг у друга время,
Хотят прожить подольше, до конца,
И у соседа вырвать хоть неделю.



# ВАЙНОЙ ХРЫШЧОНАЕ ЮНАЦТВА




У ліку тых, хто аддаваў змаганню з фашызмам сваю маладосць, — прафесар нашага універсітэта заслужаны дзеяч навукі Беларусі Уладзімір Васільевіч Анічэнка, кніга якога "Повязі лёсу" нядаўна ўбачыла свет у Гомелі. Твор выдадзены дзякуючы выдавецкаму комплексу універсітэта.

У прадмове да кнігі, якую напісаў старэйшы літаратар Гомельшчыны Міхась Пятровіч Даніленка, ёсць такія радкі: "Аўтар, былы вязень фашызму, затым сведка і ўдзельнік партызанскага руху ў Арліцкіх гарах Чэхаславакіі, знаёміць чытача з уласным жыццёвым лёсам і сваіх равеснікаў, іх змаганнем у глыбокім варожым тыле..."

Як прызнаецца сам Уладзімір Васільевіч, штуршком для напісання гэтай кнігі (а праца над ёй доўжылася больш за два дзесяцігоддзі) стала сустрэча з легендарным генералам Людвікам Свобадай, які і параіў былому ўдзельніку чэхаславацкага супраціўлення, беларускаму вучонаму-лінгвісту расказаць іншым пра свой лёс, пра гады змагання "за нашу і вашу свабоду". Менавіта з рук Свабоды наш суайчыннік атрымаў сваю першую чэхаславацкую ваенную ўзнагароду – ордэн "Чэхаславацкі партызан" і мемуары з аўтографам: "Таварышу Ул.Анічэнку на ўспаміны дарую. Генерал Свобада. Прага. 31.05.1963 г".

Працаваць аўтару было далёка не прста. Невыпадкова ў сваім "Слове да чытача" Ул.Анічэнка са скрухай і зразумелым болем спавядаецца: "Няма чаго граха таіць – і ў нас да былых вязняў фашызму адносіліся ў свой час стрымана, часам без належнага спачування і важкіх падстаў за гітлераўскую тыранію на чужыне".

Той, хто будзе знаёміцца з кнігай, зможа даведацца, чаму ж так доўга ўспаміны былога вязня фашызму і ўдзельніка партызанскага руху на братняй славянскай зямлі не маглі прабіцца да чытача, якія перашкоды ўзніклі на гэтым шляху. Дакументальная па сваім характары, яна багатая на цікавыя дэталі, акалічнасці не толькі ваеннага часу, але і перадваенных гадоў, пра якія піша аўтар, згадваючы сваё маленства і дзяцінства, пачатак маладосці, пазначаны пошукам уласнага месца ў тагачасным трывожным свеце. У кнізе шмат фотаздымкаў розных гадоў. З іх глядзяць на сучасніка маці і бацька, браты, родныя і блізкія аўтару землякі.

Мы бачым родныя мясціны будучага слыннага мовазнаўцы, тую хату, дзе прайшлі яго раннія гады. А таксама краявіды Чэхаславакіі: Арліцкія горы, даліны, букавы лес у мясцовых гарах, тых людзей, разам з якімі малады беларускі хлопец змагаўся супраць ворага, з кім прымаў удзел у раззбраенні акупантаў у самым фінале вайны.

Кніга Ул.Анічэнкі "Повязі лёсу" не адносіцца да мастацкай прозы, яе вызначальная якасць – хранікёрская дакладнасць, вернасць факту, падзеям і датам. З'яўляючыся па сваёй прыродзе дакументальным узнаўленнем мінулага, яна каштоўная якраз тым, што мы бачым тое жыццё, якое нам, народжаным пасля вайны, не давялося бачыць, чуем галасы людзей, з якімі нам ніколі не сустрэцца, але якія дзеляцца з намі сваімі клопатамі і болем, радасцю і смуткам.

Уладзімір Анічэнка ў звароце да чытача сціпла пазначае сваё месца ў барацьбе з ворагам, сціплы ён і як аўтар кнігі: "Свае юнацкія сцяжынкі ў родных і далёкіх краях з першых і да апошніх дзён Вялікай Айчыннай вайны я не збіраўся апісваць у мемуарных успамінах, бо не лічыў сябе за тых людзей, якія прэтэндавалі і прэтэндуюць на гістарычную ролю ў грамадстве. Праўда, мой юнацкі лёс – гэта не толькі сведчанне, але і ўдзел у антыфашысцкай барацьбе далёка ад Радзімы. Няхай і ён пакіне нейкі след у нашай гісторыі".

Хай так і будзе, бо жыццё чалавека – не толькі каскад адных выключных учынкаў і велічных здзяйсненняў, не кожнаму было суджана быць заўсёды толькі на самай пярэдняй лініі барацьбы са смерцю. Але ж і на другой, і трэцяй, і тых лініях, што за імі, таксама вялося змаганне супраць зла-насілля і нечысці, ішоў бой, як сказаў Аляксандр Твардоўскі, "не ради славы, ради жизни на земле".

**Віктар ЯРАЦ,**
**дацэнт кафедры беларускай літаратуры,**
**член Саюза пісьменнікаў Беларусі.**

## ПРЫГАЖОСЦЬ ПЛЮС ЗДАРОЎЕ

Стаць стройнымі, прывабнымі і захаваць гэтыя якасці надоўга вам дапаможа аэробіка. Студэнткам, супрацоўніцам універсітэта прадастаўляецца магчымасць займацца ёй у спартыўнай зале другога вучэбнага корпуса (вул.Кірава,119) па аўторках, чацвяргах і суботах.

Пачатак заняткаў у 17 і 14 гадзін (па суботах).

За падрабязнымі даведкамі звяртацца па тэлефоне **53-73-49**.

**ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ Ф.СКАРЫНЫ**

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:

— рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства — асістэнта;
— лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту — дацэнта;
— тэорыі і методыкі фізічнай культуры — дацэнта;
— тэорыі і гісторыі дзяржавы і права — дацэнта.

Тэрмін падачы заяў —не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699, г.Гомель, вул.Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытый публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.
Зарэгістравана ў Дзяржкамдруку 26 чэрвеня 1996г. Рэгістрацыйны № 263

Спонсар газеты -- прафком студэнтаў.

Газета набрана и сверстана на настольно-издательском комплексе ИВЦ ГГУ, отпечатана на фабрике "Полеспечать", г.Гомель, ул. Советская, 1.

Якасць друку адпавядае якасці арыгіналаў заказчыка.

Рэдактар Ул.П.БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 558.
Падпісана да друку 2.11.1999 г.